Сяргей
Законьнікаў

# ПЕРШЫ ПАЦАЛУНАК

*(Сто вершаў пра каханьне)*

Мінск, «Кнігазбор», 2007

KAMUNIKAT.org

УДК 821.161.3-1
ВБК 84(4Бен)
З-19

**Законьнікаў С.**

З-19 Першы пацалунак: сто вершаў пра каханьне / Сяргей Законьнікаў. Мінск: Кнігазбор, 2007. - 128с.
ISBN 978-985-6824-66-4.

Новая кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы, міжнародных літаратурных прэмій Украіны і Польшчы Сяргея Законьнікава «Першы пацалунак» прысьвечана самаму загадкаваму чалавечаму пачуцьцю — каханьню. Аўтар малюе чароўны сьвет, у якім валадараць, журбоцяцца, пакутуюць і радуюцца, каб стаць шчасьлівымі. Яна і Ён.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84 (4 Беи)**
Законьнікаў С., 2007,
Афармленьне, ПУП «Кніiазбор», 2007
ISBN 978-985-6824-66-4 2007

# СУНІЦЫ

Вясной паляны пачыналі сьніцца,
Хацелася туды прысьпешыць крок,
Дзе на прыпёку першыя суніцы
Паказваюць ружовенькі бачок.
Выбліскваў хуткі позірк з-пад
хусьцінкі,
А потым зноў хіліўся да зямлі.
Такія, як зярняткі-залацінкі,
Іскрынкі вабныя ў вачах цьвілі.
І сэрца калацілася ўтрапёна,
Калі раптоўна ў маладой цішы

Сыходзіліся з мілагучным звонам
Няпоўныя да верху гладышы...
Хоць дзень яшчэ высокі, як
званіца,
І сэрца не растраціла надзей.
А ўсё-ткі тыя першыя суніцы
Былі нашмат за сьпелых саладзей.

KAMUNIKAT.org

# СОНЕЧНЫ ВЕРШ

Імкліва сонечная раніца
Зямлю ў абдымкі прыняла…
Ты да мяне плывеш абраньніцай
Сьвятога боскага сьвятла.
Плывеш праз золата кляновае,
Праз верасьнёвую смугу,
Мая, але такая новая,
Што і пазнаць я не магу.
Прамень усьмешлівы і ветлівы
З тваёй далоні сум дзяўбе.
А ты наскрозь уся прасьветлена,
Як быццам і няма цябе.

# ТАЯМНІЦА

Я не вымольваў слоў
пяшчотных...
Як дождж
                    да сьмяглае ральлі,
Яны прыходзяць незваротна
На грэшнай і сьвятой Зямлі.

Іх нараджэньня таямніца
Не падуладна адкрыцьцю.
Бруіць тваёй душы крыніца
Насустрач сьпешнаму жыцьцю.

І дзівіць дар яе мілосьці
На сьвет выносіць дзень пры дні
Сьвятло глыбіннай прыгажосьці,
Пясчынкі шчодрай дабрыні.

Жыццё свой круг імкліва вершыць,
Ды застаецца вечны шлях,
І шэпт, і пацалунак першы
На разгарачаных губах.

Твой сьпеўны голас не сьціхае,
Зьяднаў ён неба і зямлю.
Жыву,
пакутую,
кахаю
І праз цябе ўвесь сьвет люблю.

*        *        *

Ёсыць назвы,

і болей нічога:

Жанчына...

Каханьне…

Жыцьцё...

Замкнута ад нас адкрыцьцё,

А ключ — пад падушкай у Бога.

KAMUNIKAT.org

*       *       *

Гэтыя бровы ўразьлёт,
Гэтыя вольныя вочы
Могуць з душы скінуць лёд,
Могуць дашчэнту сурочыць.

П'ю сьмелы зірк па глытку,
І адчуваньне такое —
Хоць на край сьвету ўцяку,
Ды не набуду спакою.

Сьцюжу або крыгаход —
Што мне ў жыцьці напрарочаць
Гэтыя бровы ўразьлёт,
Гэтыя вольныя вочы?

*     *     *

Маладым пачуцьцём
Сьвет заўжды нецьвярозы,
Іх — дваіх — не рассудзяць
Ні людзі,
Ні Бог.
У каханьні ёсьць радасьць,
Пакуты
І сьлёзы...
У каханьні няма аднаго —
Перамог.

kamunikat.org

# ТОЕ

Нітка жыцьця, што сукалася ў маі,
Туга напнутая, ледзьве ліпіць...
Што на зямлі чалавека трымае?
Тое, што нельга прадаць і купіць.

Гэта — схаваная ў памяці
сьцежка
Між заінелых, крыштальных бяроз,
Гэта — твая нечаканая ўсьмешка,
Што асьвятліла расхлістаны лёс.

kamunikat.org

Зорку надзеі лаўлю на лятуя,
Каб патрымаць і табе перадаць…
Што нас усьвеце падманным ратуе?
Тое, што нельга купіць і прадаць.

KAMUNIKAT.org

*  *  *

Старэе ўсё ў жыцці імклівым
І непазьбежна адыходзіць...
Мяняюцца ляндшафт і клімат,
Віруюць перамены ў модзе.

Дапытлівасьць рашучым чынам
Шлях у нязьведанае торыць.
Хто ўспомніць дымную лучыну,
Калі сядзіць прад маніторам?

Даўно ўжо гонка пачалася,
Каб паскарацца год ад году.

І мы гучым у новым часе
Г'удком забытым параходу.

Ды прабіваецца праз вусьціш
Жывое пачуцьцё бяз стомы.
З дрыготкіх, неспатольных вуснаў
Зноў вечнасьць чуе шэпт знаёмы.

«Кахаю…» — як вянок надзеі,
«Кахаю…» — як быцьця аснова.
Ня старыцца, а маладзее
Адно —
для ўсіх сьвятое —
Слова.

# ПРЫКМЕТЫ

Прыдумаў я свае прыкметы:
Няўдалым будзе новы дзень,
Калі на воблік,
                мілы, сьветлы,
Уранку набягае цень.

Другая ж —
                будзе дзень
шчасьлівым.
Бо ў вуснах жарты ўжо гучаць,
Бо зноў іскрынкі дурасьліва

kamunikat.org

Мігцяць у сонечных вачах.

Люблю прыкмету толькі тую,

Найлепшую з усіх прыкмет —

Калі каханая цалуе

Сваёй усьмешкай белы сьвет.

KAMUNIKAT.org

# ПОМНЮ

*Лілі*

Там,

дзе сырая зямля,

як турма,

Там,

дзе нікога,

нічога няма,

Раптам мне высьнішся промнем.

…Лета ці восень, вясна ці зіма —

Кожнай крывінкаю помню.

KAMUNIKAT.org

*　　　*　　　*

«Спачатку — ты,
　　　　　　　　а потым — я», —
Такая прымаўка твая.

Каханая, даруй за тое,
Што горкіх слоў нясеш ты крыж,
Што часам крыўды ў сэрцы тоіш,
Маўчыш,
пакутуеш,
ня сьпіш.

За непрынесеныя кветкі

І занядбаны хатні гуж,
Як і за тое, што ў суседкі
Надзвычай дамавіты муж.

За тое, што ня годзіш модзе,
Што ў іншых больш убораў ёсьць,
Што,
як дажджы,
як сьнег,
праходзяць
Твае краса і маладосьць.
Зрэдчас падумаецца жартам —
Так,
я і грэшнік, і сьвяты,

Ды ўсё ж,

калі чагосьці варты.

То вінавата ў гэтым — ты.

«Спачатку ты,

а потым — я...»

А прымаўка ў цябе — мая!

KAMUNIKAT.org

# ВЯРТАНЬНЕ РАДАСЬЦІ

Зноў няма настрою з раніцы —
Калатнеча, мітусьня.
Так ня хочацца параніцца
Аб калючкі злога дня.

Справы,
словы бесталковыя
Сталі ў горле камяком,
І таму невыпадкова я
У вакно гляджу цішком.

kamunikat.org

Мо, затурзанага сьпешкаю,
Сёньня лёс не абміне:
Ці каменьчыкам,
ці сьнежкаю
Стукне ён у шыбу мне.

На імгненьне радасьць вернецца,
Каб душу сагрэць найперш…
Аблачынкай недаверлівай
Ты плывеш у гэты верш.

KAMUNIKAT.org

# УСЬМЕШКА ЖАНЧЫНЫ

Верце — ня верце, а сьвята прычынай
Стаць можа простая ўсьмешка жанчыны.

Той. што ў вагоне шматлюдным сядзела
І прад сабой невідушча глядзела.

Моўчкі глядзела ў душу, і падобна,
Ціхай жанчыне было надта добра.

І не хацела, а сьветлым сакрэтам
Стала дзяліцца з усім белым
сьветам.

Раптам адчуў я душою і целам,
Што электрычка праз вечнасьць
ляцела.

Везла ў нязнанасьць усьмешку бяз
страху
Зорнымі рэйкамі Млечнага
Шляху...

Дзень непрыкметны застаўся са
мною,
Сыпеліць ён зноў пачуцьцё
незямное.

Смутку прычына і шчасьця
прычына —
Тая звычайная ўсьмешка
жанчыны.

KAMUNIKAT.org

*  *  *

Мне сьніцца мора.
Там, за валам,
Што белапенна лёг да ног,
Ты, нечаканая, паўстала,
Над галавою — рук вянок.

Трымцела радаснае цела,
Крывінкай кожнаю жыло,
Нібы ў сябе ўвабраць хацела
Усё — да кропелькі — сьвятло.

Яно зьвінела і сьпявала,

І цалавалася з вадой.
Зноў сьвет прыціхлы хвалявала
Сваёй загадкай маладой.

І не забудецца ніколі,
І не паўторыцца нідзе ж…
Як промень трапяткі, паволі
Ты па каменьчыках ідзеш.

KAMUNIKAT.org

# РАЗЬВІТАНЬНЕ З КАКТЭБЕЛЕМ

Мора,
каб хацеў,
                                        дык не сурочыш
Разьвітальным пошапкам сваім.
Закружыўся чаек крык сірочы.
Мы над ім разгублена стаім.

Ты яшчэ ўсьміхаешся шчасьліва...
Толькі стыне,
                                стыне на губах
Цёплы ўздых салёнага заліва.
Стэпу палынковы горкі пах.

*           *           *

Круг звыклай мітусьні,
Зададзенасьці быта.
Мільгаюць спорна дні,
І многа іх забыта.

Ды ўспомні час, калі
Мы ў нейкім утрапеньні
Ня дням падлік вялі,
А кожнаму імгненьню.

Цьвіў радасьці язьмін,
І зеляналі душы.

Дагэтуль успамін,

Як вецер,

вусны сушыць.

І часта ў сьне да нас

У вочы заглядае

Далёкая вясна,

Як воля, маладая.

Мінулага жарству

Варушыць дум карэньне,

Іх ніткі перарву —

І прыйдзе разуменьне,

Што сталы, мудры сьвет
Яшчэ памаладзее.
Ступаюць дзеці ўсьлед —
Твая. мая надзея...

Чаму ж пражыты дзень
Глядзіць усё ж гаротна?
Над безданьню ідзем,
І шлях наш — незваротны!

KAMUNIKAT.org

# ТВАЁ ІМЯ

Тваё імя варушыцца ў душы,
Як птушанё,
што выпала з
гнязда…
Лёс за мяне падумаў і рашыў —
Людзей ня радасьць вучыць,
а бяда.
Даўно надзеі сьвечку патушыў,
Што доўг за ласку я змагу
аддаць…
Тваё імя варушыцца ў душы,
Як птушанё,
што выпала з гнязда.

*    *    *

Сваіх гадоў ні вязень,

ні ўладар,

Вяртаюся назад — заўжды ў тваю

сьвятліцу.

За чорны цень,

што ўпаў на мілы твар,

Жыцьця акрайца ўжо ня хопіць

адмаліцца.

Куды ж мне жаль,

трывогу,

боль

падзець?

Прашу хвілін,

а іх становіцца ўсё меней,

Каб доўга-доўга на цябе глядзець,

Нібыта піць ваду крынічную са

жмені.

KAMUNIKAT.org

# БЯССОНЬНЕ

Ня сьпіцца нешта мне сягоньня,
Хоць цела рвецца на спачын...
Там —
за вакном —
ляціць пагоня
Імклівых,
вольных аблачын.

Іх толькі Бог адзіны пасьвіць,
Але і Ён ня мае пут...
І ты ня сьпіш...

kamunikat.org

І пальцы ў пасмах —
Знак неадпрэчлівых пакут.

Мая душа затрапятала
Прад змрочнай прорвай
адкрыцьця:
Каб разам быць — хвіліны мала,
І мала цэлага жыцьця.

І, можа, з гэтае прычыны
Табе таксама не да сну...
Ляцяць,
зьнікаюць аблачыны
І не зьліваюцца ў адну.

# НЕ ХАЧУ ВЕДАЦЬ

Гэты дзень — нібы знойдзены
грошык,
На якім спатыкнуўся прамень...
Падзівіся:
накольki харошы
Наш,
украдзены ў вечнасьці,
дзень!

І няважна,
што хутка заслоніць

kamunikat.org

Радасьць вабную

хмарка нуды.

Дзень сьцякае па чуйных далонях,

Каб застацца ў душы назаўжды.

Час ня ходзіць па крузе,

па сьледу,

Гэты дзень

больш ня ўбачыць Зямля…

І таму мне ня хочацца ведаць,

Што было

і што будзе пасьля.

KAMUNIKAT.org

*            *            *

Лёс прывядзе да апошняй

разлукі...

Ведай —

ня трэба скарацца журбе...

Помняць свой час

вочы,

вусны

і рукі,

Каб блаславіць і суцешыць цябе.

Гэта жыцьцё...

Што ж, яшчэ памыліся,

Ды не засьмечвай душу

драбязой...
Тут без мяне
ўсё ж
за нас памаліся...
Толькі ня словам,
а ціхай сьлязой.

KAMUNIKAT.org

*      *      *

За маім акном шалее вецер,
Рве з галін апошнія лісты...
Як сьцюдзёна стала
ў гэтым сьвеце,
Ведаеш пра тое толькі ты

Ноч даўно скубе сабе надточкі,
Пацьмянеў і карацее дзень.
Ды і я,
нібы сышоў упрочкі
З крэўнага жыцьця...
Застаўся цень.

Што ні год — даўжэй вандроўка

тая

Па глухім узьмежку лет і зім.

Толькі ты назад мяне вяртаеш

І рукой,

і позіркам сваім.

Часу холад

стукаецца ў грудзі,

Як пасыльны вечнай нематы...

Што са мной было,

чаго ня будзе —

Ведаеш пра гэта толькі ты.

*          *          *

Калі закіпае ад рэўнасьці кроў,
Калі ўжо стрымацца ніяк
немагчыма,
Успомні — мы ведаем лепшую з
моў...
Давай пагаворым вачыма.

KAMUNIKAT.org

# АБЯРОГ

Дні карацеюць — надточваюць
ночы.
Цень неадступнага
сьледам бяжыць.
А зазірнеш у адданыя вочы —
Гэтак нясьцерпна захочацца жыць.
Нашая радасьць —
з сумненьняў і болю
Час,
нібы конік,
вушамі стрыжэ..

Пэўна,

ёсьць нейкая мудрая воля,

Нех та цябе і мяне беражэ.

*       *       *

Пранясуцца ў парыве адным дождж і сьнег,
Каб упасьці на крэўныя гоні адчайна.
Перад воляй вышэйшай наш радасны грэх
Стане сьвятасьцю праведнай і незвычайнай.
Ці раней,
 ці пазьней —
  нас абдыме зямля,
Адпускаючы душы да неба ў адведкі.

Плоць у плоць перальецца пасьля

спакваля,

І ад еднасьці гэтай народзяцца

кветкі.

Выйдуць двое сюды,

каб сушышыць свой крок,

Каб адчуць,

як трапеча жыццё несьціхана.

Усьміхнецца іх шчасьцю здалёк

васілёк,

Галавою прыветна кіўне

закаханым.

# НІЦАЯ ВЯРБА

Ніцая вярба ў знаёмым парку
Дыхала каханьнем і вясной.
Шэпты,
Пацалункі,
Нават сваркі
Засланяла ад усіх сьцяной.

Над зялёным храмам небязбожна
Сонца несла гордае чало,
І, відаць, таму ў сустрэчы кожнай
Сумнага фіналу не было.

А цяпер галіны сыпілаваны…
Ствол, як крыж...
Пар эзы на кары…
Той прагал, нібы скразную рану,
Прадз імаюць хіжыя вятры.

Бачу: прыпынілася жанчына
І стаіць, як ніцая вярба,
І глядзіць здзіўлёнымі вачыма,
У якіх пяшчота і журба.

KAMUNIKAT.org

# ЦІШ

Зямлю абняла незнаёмая ціш,
Яна не асудзіць — нямая.
Ты ў вочы мае так адчайна
глядзіш,
Што нават дыханьне займае...

KAMUNIKAT.org

## «Я КАХАЮ ЦЯБЕ...»

У сьвеце грэшным,
Жорсткім
І суровым,
Дзе вісьне дух тагальнае маны,
Ёсьць толькі тры
Высокіх, чыстых словы,
Якім ніхто ня вызначыць цаны.

Сьціскае сэрца непаўторна
вусьціш,
І падаецца, што спыніўся час,
Калі прашэпчуць спаленыя вусны
Тры словы —

Як жыццё,
Кароткі сказ.

І я,
Як гэты сьвет,
Сівагаловы,
Нібы драбочак солі ў час вайны,
На чорны дзень пакіну тыя словы,
Бо ведаю, што ім няма цаны.

KAMUNIKAT.org

*    *    *

А не хапае адзінага — часу,
Вось і шукаеш яго да зьнямогі.
Толькі дарэмна, бо рэшткі запасу
Зноўку ў мяне забіраюць дарогі.

Марна зацятую долю аспрэчваць,
Дзе засьвіціўся прагал за
прагалам.
Радасна грэцца шэптам
сустрэчным:
«Божачка,
як я засумавала...»

## НЯ ВЕРЫЎ Я

Ня верыў я, што так бывае.
Ды міг той вечна сьцерагчы.
Рука пяшчотная, жывая
Сьцякла паволі па плячы.

Адкуль, з якіх глыбінь сусьвету
Яна, як промень, прыплыла
Халодным, непрытульным летам
Да незнаёмага жытла?

Не расчыняла ўладна дзьверы,
Цішком ня стукала ў акно,
Ды ў тое змусіла паверыць,

У чым зьняверыўся даўно.

Лічыў сябе вар'ятам потым,
Нармальны гэта не сасьніць...
А змог жа нечаканы дотык
Зямлю і неба замяніць.

Маланкай згадка скронь апаліць,
Адпусьціць багна мітусьні.
Зноў непрыручаная памяць
Цябе нясе з далечыні.

Ступой пакорлівай і гордай
Па долі крочыш наўскасяк.

І перахопіць раптам горла,
Не пракаўтнуць сухі камяк.

Скажы, якім багам маліцца
За гэта ціхае: «Дазволь
Мне, хоць на хвілю, прытуліцца
І падзяліць твой сум і боль...»

KAMUNIKAT.org

# ПАБУДЗЬ СА МНОЙ

Асеньняя шчымлівая дарога,
І ты — неспадзяванкай незямной.
Я пра цябе ня ведаю нічога…
Пабудзь са мной.

Пабудзь самной…
Ня я шапчу, а лісьце,
Што шаргаціць у сутані лясной.
Было вясёлым і яно калісьці…
Пабудзь са мной.

Якая далеч мгліцца за плячамі,
Якая высь над першай сівізной!

А мы ніколі гэтак не маўчалі...

Пабудзь са мной.

Нішто мяне ня ўсьцешыць...

І ня зьдзівіць...

Ты будзеш самай лепшай навіной.

Вачэй тваіх адтайваюць ільдзінкі...

Пабудзь са мной.

Чым станем потым мы ў вялікім

сьвеце:

Зямлёй,

Травой

Ці зоркаю скразной?

Прамень надзеі не згасае,

сьвеціць…

Пабудзь са мной,

Пабудзь са мной…

KAMUNIKAT.org

# ПРАЎДЗІВЫ ЖАРТ

Хаваў ад цябе цішком
Хоць нейкі драбочак волі.
Ты шчоўкнула гучна замком,
Сказала рашуча: «Даволі!»

Пакінуць для вершаў хацеў
Маленькі акраец часу.
Твой голас агнём зазіхцеў:
«Ты бачыш, які ён ласы!»

Падумаў тады ўратаваць

Хоць думкі,

іх жа ня ўгледзіш.

Ды чую:

«Пакінь жартаваць,

Блукаць па закутках недзе».

Хто толькі мяне ні скубе...

І ты кажаш:

«Мала, мала...»

Усё аддаю табе,

Дзе наша ні прападала!

KAMUNIKAT.org

# ЧАРГА

Лёс хітра круціць шуры-муры,
І што ён толькі не вярзе...
Жыцьця палову, як прыдурак,
Я мёрз і сьмягнуў у чарзе.

Калі ж каўтнуў глыточак волі
І кінуў позірк з-пад павек,
То сам сабе сказаў: «Даволі...
Ну што ж ты, мілы чалавек?»

Туды, дзе зноў натоўп тупоча,

Глядзець я нават не магу.
А лёс мяне і зараз хоча
Загнаць у нейкую чаргу.

Я праглыну любую казку,
Хоць не паверу ёй, ані…
Але ў чарзе стаяць па ласку?!
Ня буду!
Божа, барані…

*          *          *

Жыцьцё людзкое не здаецца

сьмешным,

Як рана,

І крывяніць,

І баліць...

Дык пасыіяшайся радасна і

ўсьцешна

Галоўку-аблачынку прытуліць.

А потым будзе ў вечнасьці дарога,

Яе ніхто ніколі не міне.

Я ў Бога не прасіў пакуль нічога,

То, можа, ён

І паспрыяе мне…

Каб паплылі за мною без прынукі
Праз той прастор —
Халодны і пусты —
Тваёй міласьці радасныя рукі,
Твайго каханьня белыя бінты.

KAMUNIKAT.org

# НЕ ЗЬНІКАЙ!

Ніхто не ўгадае, што будзеў
жыцьці,
Сакрэт мае важкае вечка...
Таму я прашу — не зьнікай,
пасьвяці
Анёлам прынесенай сьвечкай.

# УЗЬНЯСЕНЬНЕ

Веру: душу зразумее душа.

Вусны ня трэба сьціскаць гаротна...

Мілая,

Нас жа ніхто не змушаў

Так пакахаць —

Няўзнак.

А сьмяротна.

Слаўлю каханьне.

Што б ні было,

Хай прарастае яго насеньне...

Еднасьць дваіх — не няволі сіло,

Гэта маё і тваё ўзьнясеньне.

kamunikat.org

# ПРЫЙШЛА!

Душы маёй хацелася збавеньня,
І ты прыйшла,
І сонца прывяла.
Я ў гэтым сьвеце быў адно
імгненьне,
Але на вечнасьць хопіць мне
сьвятла.

*          *          *

Зноў дажджынкі — нябесная
паства,
Быццам сьлёзы, па твары цякуць…
Ці твае неспакойныя пасмы
Лёгкім дотыкам лашчаць шчаку?..

Можна вочы закрыць і памарыць,
Быць удзячным хвіліне любой,
Нават той, як нардычныя хмары
Набрыняюць завейнай журбой.

А пакуль льецца радасьць такая,

Што адольвае часу разьбег...
Я стаю пад дажджом, не ўцякаю
—
Толькі б ты не дагнала мой
сьнег…

## НЕЗАБЫЦЦА

Думай нуднай, нядрэмнай
Не азмрочвай чало.
Так, жыцьцё недарэмна
Нас мілосьцю звяло.

І калі па свабоду
У нязнанасьць пайду,
То вярнуся заўсёды,
Каб адпрэчыць бяду.

Мне пасобіць у гэтым
Сьвет, які я люблю, —
Не бяз толку паэты
Засяляюць Зямлю.

Толькі жудасьць прысьніцца,
Напалохае змрок, —
Як ля шыбы сінічка
Свой падасьць галасок.

Толькі зманіцца вусьціш
Засьціць новы твой дзень, —
Як сьвітальныя вусны
Пацалуе прамень.

Незагойную больку
Сум няхай не дзяўбе...
Я памру не настолькі,
Каб забыць пра цябе.

## «НІХТО!»

«Ніхто!» —
Гэта слова ня ведае страху,
Прыйшло і сказалася,
З тым і жыву.
Яго прамаўляю, нібыта на плаху
З адчайнай пакорай кладу галаву.

«Ніхто!» —
Гэтым словам я час затрымаю,
Які можа стукнуць зьнянацку ў
акно
І вестку прынесьці, што доля

зямная
Зьлілася раптоўна ў імгненьне адно.

Але і тады, як мяне ўжо ня стане,
Калі дождж сасьнегам спаткаюцца, то
Табе на зьмярканьні або на сьвітаньні
Успомніцца ўпэўнены голас:
«Ніхто!»

## КАРОТКАЯ НОЧКА

Дзень — як прыгон,
Ды нарэшце міне,
Я прычакаю жаданую госьцю.
Ночка кароткая любіць мяне,
Лашчыць і шэпча нязнанае
штосьці.

Толькі цяпер адчуваю сябе
Вольным,
Як неба,
І ў думках, і ў слове.
Зерне спакусы радок мой дзяўбе,

Кроплі самоты даверліва ловіць.

Цуд існаваў ці яго не было?
Радасьць зарана сьпяшаецца
ўпрочкі.
Вочы асьлепіць чужое сьвятло,
Ды не сурочыць кароткую ночку.

KAMUNIKAT.org

# ЦЯГНІК

Цягнік пад гонкай назвай Час
Не падарвецца і на міне.
Ляцеў бяз нас,
Ляціць пры нас,
І там, у далечы, ня згіне.

Вось-вось цягнік мяне міне,
Бо колыстыкі ўжо ня лічаць...
І раптам здасца,
Што ў акне
Убачыў мілае аблічча.

Ты вуснамі заваруш ы —
Я прачытаю словы высяў.
І крык спалоханай душы
Над сьветам прагучыць:
«Спыніся!»

Мой страх
Цягнік з сабой панёс,
Ты засталася на пэроне...
Хоць сэрца стукае ўразнос,
Я падбягу,
Як верны пёс,
Каб прытуліць халодны нос
Да цеплыні тваіх далоняў.

*        *        *

Вецер галін не хістае,
Звонкім лісьцём не шуршыць.
Восень стаіць залатая
І на зямлі
            і ў душы.

Лёт павуцінкі іскрыстай,
Першага інею сьлед.
Моўчкі,
Празрыста ўрачысты,
Сьвецішча мудрасьцю сьвет.

Ты з ім даўно ў ціхай змове,
Родную ён пазнае —
Столькі сьвятла і любові
Вочы праменяць твае.

І ў безгалосьсі прыроды,
Пэўна, ясьней, чым калі
Рэхам адклікнуцца годы,
Што ў гэты дзень прывялі.

Вецер галін не хістае,
Кружаць лісьцёвыя сны…
Восень мая залатая,
Восень з паглядам вясны.

KAMUNIKAT.org

## СЬНЕГАПАД

А сьнегапад нарадзіўся раптоўна,
Так, як прыходзіць каханьне да
нас…
Сьветла вяртацца, глядзець
малітоўна
У маладыя, незаплямлены час.

Ён быў да сьвету ўсяго
невідушчым,
Быў неабачліва-хмельны такі,
Каб прадзірацца адважна праз

пушчу,
Быццам праз долю — Наскрозь, напрасткі.

Сцежкай глухой, дзе чакалі спакусы,
Час, як сабака, за намі пабег.
Млосна палалі і шчокі, і вусны,
Цёплым здаваўся расхрыстаны сьнег.

Не варажылі: «А што будзе потым?»
Згодны былі разам з веяй

сплываць,
Ці ў зьледзянелых, высокіх сумётах
Гэтак, як сосны, маўкліва стаяць...

З вечнай дарогі ў нязнанасьць —
Ня збочыш,
Час не адкруціш ніколі назад...
Сьвецяцца шчасьцем зялёныя вочы,
І не спыняецца той сьнегапад.

# РАТУНАК

Пашчасьціла мне ці не?
Гаворка якраз не пра гэта.
Жыву я ў той старане, .
Якая нічым не сагрэта.

Яе неспазнаны лёс
Няясныя мае абрысы:
Тут мора хлусьні і сьлёз,
Тут тлее над воляю прысак.

Хто толькі рук ні прыклаў,
Каб стала чужою Айчына.
І, можа б, долю пракляў,

kamunikat.org

Калі б не яна —

Не жанчына.

Дасюль ратуюць мяне

Ад подлага рабства заўсёды

Яе каханьне і гнеў

Размахам жаданай свабоды.

А я за мілосьць і гром,

За вочы,

Што скінула неба,

Расплачваюся жыцьцём…

І рэшты —

Ня трэба!

# САЛОЎКІ

## *(баляда)*

Там, дзе вербы ля крыніцы,
Як зялёная падкоўка,
Адчыняла аканіцы
Ранку вёсачка Салоўкі.

Дацямна зямлю арала,
Ад хвароб зьбірала зёлкі,
На старэнькіх кроснах ткала
Дываны, нібы вясёлкі.

І звычайна вечарамі,
Што прапахлі мёдам, сенам,

Душы ўсе ў адну зьбірала
Песьняй роднай, задуменнай.

Кожны госьць
Людзей распытваў:
«Хто ж так хораша сьпявае?»
— Бабка Ганна, дзед Мікіта...
Хата трэцяя ад краю...

Час ляцеў для ўсіх няпросты,
І ня знойдзеш вінаватых,
Што ня стала краю ў вёсцы…
Вёска стала толькі хатай.
Сумна жыць, Але патрэбна

Век адмераны адолець.
«Шумяць вербы каля грэблі…» —
Чула неба, Чула поле.

Сьвет, адданасьцю сагрэты,
Сам рупліва колас песьціў.
Ды прыйшло і тое лета —
У Салоўках змоўклі песьні...

На бярвеньні ля паркана
Мы сядзім... Красуе жыта...
«Засьпявай, бабуля Ганна…»
А ў адказ: «Няма Мікіты...

Ён мяне — кажу праўдзіва —
У руках насіў, як сьвечку.
Спадзявалася на дзіва —
Будзе сьпевам цешыць вечна.

Хай ня чуе боль сірочы
Сьвеце ясны,
Сьвеце белы.
Як закрыла дзеду вочы,
І сама тады зьнямела…»

Я праз два гады наведаў
Кут, які душу трывожыў.
Поле скрозь…

Няма і сьледу

Ад Саловак тых прыгожых.

Не вітаюць вербы госьця,

І ня шчодрыцца крыніца…

Пад чаромхай на пагосьце

Шэры фуд Сырой зямліцы.

Галавою да галоўкі

Дзед з бабуляю вякуе...

Заліваюцца салоўкі,

Толькі іх ніхто ня чуе.

## ДВА ЛЁСЫ

Гэта неба ад краю да краю,
Пад якім давялося мне жыць,
Я да кроплі ў душу забіраю,
Разапнуты на вечным крыжы.

Гэты крыж безагляднай любові
На вяршыню пакутаў узьнёс,
Каб за сьмерцю прадоўжыўся ў
слове
Існым часам няспраўджаны лёс.

Гэты лёс, хоць заб'е, а дазволіў,
Каб сапраўдныя людзі прыйшлі,
Пазмагацца за праўду і волю,
Перш чым стаць

простай жменькай зямлі.

А яшчэ ёсьць спагадлівы позірк,
Так глядзіш на мяне толькі ты.
Іскры смутку
і радасьці позьняй
Панясу за парог нематы.

Жураўлём у сілё
сэрца б'ецца,
Кліча горняга выраю клін...
А мая Беларусь застаецца.
На вякі.
Назаўсёды.
Амін.

# радкі маёй вясны



# А Я ІДУ…

А я іду ля выгану па ўзьмежку,
Трапеча сэрца радасна ў грудзях…
Пад хусткамі хаваючы усьмешкі,
Жанчыны ўсьлед паблажліва глядзяць.

А на гары мяне чакае сена —
Цудоўная, духмяная пасьцель.
Вароты зарыпелі і аселі,
Нібы крыло, якому не ўзьляцець.

kamunikat.org

Вунь неба занялося зараніцай,
Вось вусны промень птушанём дзяўбе…
Я ведаю, што ты мне будзеш сьніцца,
І крочу ўпрочкі, нібы да цябе.

KAMUNIKAT.org

# БЕРАГІ

Бераг твой узносіцца абрывам,
Бераг мой — нізінны, лугавы.
На тваім — табун сонечнагрывы,
На маім — духмяны пах травы.

А між імі серабро рачулкі,
Радаснай, жывой, нібыта ртуць.
Кожны дзень цябе я клічу —
Чуеш,
Ды мяне абходзіш за вярсту.

Я брыду прывялымі пракосамі,

kamunikat.org

(Вось дзівак, як збоку паглядзець!),
Коні на мяне цікаўна косяцца,
Дзівяцца хлапечае бядзе.

Прыгажуня, сядзь хутчэй у лодку
І вяслуй праз плынь,
Стань на траву…
Зёлкі тут прывабныя, салодкія…
Коні ўслед да нас пераплывуць!

# ЧАКАНЬНЕ

Хоць дождж і б'е,

і лашчыцца,

А ты усё адно

У сінім лёгкім плашчыку

Сьпяшаешся ў кіно.

Куды ад суму дзенешся? —

Ня ведае ніхто.

З маўклівааю надзеяю

Брыдзеш каля платоў.

А потым чуйна слухаеш

Чужую казку слоў.
Пакуль у цёмным клюбе
Ня ўспыхне зноў сьвятло.

У сэрцы ўсё ня месьціцца,
Дый некаму аддаць...
Ідзеш за жоўтым месяцам,
Блішчыць сьлюдой вада.

А хутка тут засьцюдзіцца
Сьняжынны карагод.
Ты верыш: нешта збудзецца
Цяпер, а мо праз год.

…Хоць дождж і б'е,

і лашчыцца,

А ты усё адно
І заўтра ў лёгкім плашчыку
Спяшаешся ў кіно.

KAMUNIKAT.org

# МАЎЧАНЬНЕ

У кронах дождж зашоргаў
палахліва,
А ты ў далонь зьбіраеш пырскаў
мак.
Сьмяешся потым, як дзіця,
шчасьліва,
Што не ўсьміхнуцца нельга мне
ніяк.

Слоў не чакаю...
П'ю віно маўчаньня,
А позіркам твой кожны рух
лаўлю...
І чую я, як недзе за плячамі
Садзіцца лісьце ціха на зямлю.

kamunikat.org

# СПАТКАНЬНЕ

Якая музыка жыла
У кожнай новенькай краплінцы,
Калі насустрач ты ішла
Праз дождж
па радаснай сьцяжынцы!

Рукой махаючы здаля,
Ты не ішла,
                    а ўжо ляцела.
Гучалі неба і зямля,
Як зьлітыя — душа і цела…

Куды б вясна ні прывяла,
Мне будуць помніцца да скону
Сьцяжынка ля твайго сяла,
Той дождж
і сьпеў вачэй зялёных.

KAMUNIKAT.org

# ЕДУЦЬ МАЛАДЫЯ

Сонца высіць над вёскай,
Як вясельны каравай.
— Едуць, едуць! — пагалоска
Паляцела з краю ў край.

Песняй даўняй сьвет абуджан —
Пастараліся сваты.
Па дарозе, нібы ў бубен,
Б'юць зацята капыты.

Чорнай хмаркай — коней грывы,
Вэлюм — птушкай трапяткой.

Тройка коціцца імкліва
Заінелым бальшаком.

Ім двaім ня страшна сьцюжа.
Ім бы так ня дзень — гады.
Маладая рдзее ружай,
Ясны месяц— малады.

Вы мяне прабачце, людзі,
Ды ў вазок бы сеў і сам...
Каб аж сэрца рвала грудзі.
Каб аж полаз — напалам!

# ТАБЕ АДНОЙ

Табе адной я нёс пяшчоту,
Ды па дарозе разгубляў
Сярод сьнягоў,
Слаты.
Сьпякоты,
Сярод пустых размоў, забаў.

Прыйшоў незатаптанай сьцежкай
І стаў, як месяц, пры акне,
А ты з даверлівай усьмешкай
Глядзела моўчкі на мяне.

Без ушчуваньняў і папрокаў
Руку ўладарна падала,
І я пайшоў нясьпешным крокам
На водбліскі твайго сьвятла.

І слова, што ў душы зьвінела,
Цьвіло згаданаю вясной,
Было таксама зразумелым
Табе адной,
Табе адной.

KAMUNIKAT.org

*       *       *

Увагай шчырай,
Пацалункамі
Не надакучыш любай —
І вочы адтаюць, як лункі,
І сонечна сьмяюцца губы.

Уся яна, як сад маёвы,
Напоўніцца сьвятлом пяшчоты…
Шкада, што казачныя словы
Мы сквапна беражэм на потым.

# ЗАЛАМІЎ АСІНКУ ХЛОПЕЦ

Заламіў асінку хлопец,
Думаў — кралю прысушу.
А ў яе няма клапотаў,
Точыць сэрца і душу.

Вусны сьпелыя, як вішні,
Бровы, нібы ўзмах крыла.
Ўсё аддаў бы, толькі б выйшла,
Толькі б голас падала.

Ах, як хлопец занядужаў,

Сеў ля плоту на траву
І ў цяжкой гаротнай думе
Зьвесіў сумна галаву.

Счырванела, як каліна
(Добра, што ня так відно!),
Падышла бліжэй дзяўчына,
Прашаптала ледзь чутно:

«Ладна, пацалую ўпотай...
Ты, як сыч той не глядзі!
І ня грукайся ў вароты.
Мамку лепей не будзі!»

kamunikat.org

# ВЯСЛО

Ты помніш?
Ноччу чорнай,
Як месяц не сьвяціў,
Крадком — у дзедаў човен.
І наўпрасткі — у ціш.

Нас туманы хавалі.
І вецер быў нам брат.
А човен несьлі хвалі
Да берага, у сад.

Там яблык самы сьпелы,

Стаіўшы мройна дых.
Нібы Адам і Ева,
Дзялілі на дваіх.

Сьвітаньня спеў празрысты.
Ты ў ім цьвіла, жыла...
Мы прыплылі на прыстань,
Ды толькі без вясла.

А дзед злуецца ўраньні:
— Бач, чэрці...
Не да сноў...
Але ў цяньку старанна
Вясло габлюе зноў...

Ты помніш?

Ноччу чорнай

Іду я за сяло...

У дзеда новы човен

І новае вясло.

KAMUNIKAT.org

# ЧАРОМХАВЫЯ ВЁСНЫ

Помніцца час разьвітальны —
Пошчак салоўка куе,
Пахнуць чаромхай сьвітальнай
Цёплыя вусны твае.

Неба высокае родніць
Зь вечнай зямлёй сьпеўны пах —
Роснай галінкай чаромхі
Затрапятаў Млечны Шлях.

Следам за радаснай веяй
Вёснаў нямала сплыло.

Зараз бяз нас маладзее
Квеценьню белай сяло.

Сьцежкай іду асьцярожна,
Згадка душу саграе...
Пахнуць сьвітальнай чаромхай
Цёплыя вусны твае.

KAMUNIKAT.org

# МАЙ

Сэрцам адчуваю —
Ах, як сонцу люб
Маладога гаю
Кучаравы чуб.

Ліст цалуе кожны,
Лашчыць прамянём.
Апячыся можна
Зеляным агнём.

Ціхае: «Кахаю…»
Палыхне, як жар.

Стоена дыханьне,
Палымнее твар.

Адымі далоні,
Вызвалі хутчэй
Зь іхняга палону
Сыпеўны бляск вачэй.

І, як маеш літасьць,
Вусны не хавай.
Стань, як гай, адкрытай,
Вольнай, нібы май.

kamunikat.org

*       *       *

А за вясной акрыленай ня ўгнацца,
Як не злавіць струмені ручая…
Гляджу —
Між майскіх сонечных акацый
Мільгае постаць лёгкая твая.

Наіўна думаў —
Перайму хоць летам,
Спаткацца будзе час нам — дзень вялік.
А першы ліст павіс над белым сьветам

І, як твая касынка, дзесьці зьнік.

Ну, пачакай...
Яшчэ ў запасе восень.
Бо я ж цярплівы, ведаеш сама.
Ды ўсё ж сябе суцешыць не ўдалося —
Завеямі даўно гудзе зіма.

KAMUNIKAT.org

*        *        *

Нас  вывела сьцяжынка лугавая
На той абрыў,  адкрыты ўсім
вятрам,
Дзе беражанкі-ластаўкі
ўсплываюць
З нор земляных
 у неба сіні храм.

Салодка ім лунаць над вечным
сьветам
У пругкай недасяжнай вышыні,
Глядзець на дол,
                    дзе радасна, прыветна

Міргаюць кветак сонечных агні.
За імі ты імкнешся ў захапленьні,
І разьвінаеш рукі — два крылы...
І адчуваю я ў нямым зьдзіўленьні,
Што для цябе зямны абсяг малы.

І боязна становіцца, дзяўчынка,
Аж сэрца халанее пакрысе —
А што,
калі цябе,
як аблачынку,
Залётны вецер раптам панясе?

# КЛАДКА

Завершыць хутка лета
Свайго быцця стажок.
Вясёлку цёплых кветак
Рассыпаў беражок.

Ляшчына сьцеражэцца,
Хавае спарышы.
Над плыньню ціхай — жэрдкі...
Ды боязна ў душы!

І толькі я ступіла
На кладачку нагой,

KAMUNIKAT.org

Як пад вярбой пахілай
Убачыла яго.

Сустрэча мне такая
Зусім не ў галаве.
А ён здалёк гукае,
Сыпяшае па траве:

— Дай цябе я, маладу,
На той бок перавяду…

Мне б адказаць адразу,
Што ён чакаў дарма.
Ды ахінула радасьць —

І цьвёрдых слоў няма.

А кладка гнецца, гнецца
Да самае вады.
А хлопец мне сьмяецца —
Вясёлы, малады.

Так заглядае ў вочы,
Што боязна зваліцца.
І хочаш ці ня хочаш,
А мусіш прытуліцца.

Няма ніякай радачкі
Ад гэтакай бяды...

Ой, кладка,

мая кладачка,

Вядзеш мяне куды?

KAMUNIKAT.org

*           *           *

Дажджы ўжо надакучылі...
Рыпіце, палазы!
Цалуюць твар пякучыя
Гарэзы-маразы.

Бярозкі ціха журацца,
Сьмялеюць капыты.
Ад прадчуваньня жмурацца
Вясёлыя сваты.

Завеяны, замецены
І поле, і рака...
Твая каса расплецена
Для любага дружка.

*       *       *

Бэз духмянай весткаю
Закрануў плячо.
Без пары нявесьціцца
Мілае дзяўчо.

То сядзіць задумліва
З кнігай ля акна,
То на танцы тлумныя
Бегае яна.

То дамаці лашчыцца,
Ціхая, як цень,

KAMUNIKAT.org

То імклівай ластаўкай
Хоча паляцець.

То радню аспрэчвае,
То маўчыць паўдня...
Таямніца вечная —
Сэрца глыбіня.

Сьвет, глядзі з усьмешкаю.
Сум дзяўчу лячы.
Са сьлязой няўцешнаю
Цуд свой разлучы.

# ДЗЕСЯЦІКЛЯСЬНІЦЫ

Пад кронамі купчастымі
Ляжыць ружовы сьнег...
Сьцяжынкай пакручастаю
Прабег раптоўна сьмех.

Ідуць дзесяцікласьніцы
З «апошняга званка»,
Лагодзіць твары ласкаю
Духмянасьць сьвежака.

Мяцеліцы пялёсткавай
Шчымлівы халадок

Прымае ў сэрца з лёгкасьцю

Сямнаццаты гадок.

Ён верыць —

Хутка спраўдзіцца

Надзей усіх прагноз

З нязначнаю папраўкаю

На час і ўласны лёс.

Іх хвалю запаветную

Страмчэй,

Жыцьцё.

Ўзьнімай!

Шуміць зялёным ветразем

Над сьветам добры май.

На незнаёмым беразе
Прыстануць іх чаўны…
Зямля ў сукенцы беленькай
Бяжыць на выпускны.

KAMUNIKAT.org

## СЬЦЕЖКА АД СТУДНІ

Як чарацінка крохкая,
Плывеш і не прыстанеш.
— Нядоўга ж так, —
дзед вохкае, —
Пераламіцца ў стане.

Сьмех у адказ пасыпплецца,
Старэча хмыкне ў вусы.
А вецер пад касынкаю
Сваволіць з пасмай русай.

У вёдрах сонца плавае,
Сьпякотна сьлепіць вочы.

Таму, напэўна, жвава я

З тваёй дарогі збочваў...

І сьцежка тая помніцца,

І сьмеласьці даволі...

Больш чарацінка з поўным мне

Ня стрэнецца ніколі.

KAMUNIKAT.org

# КВЕЦЕНЬ

Цьвітуць сады шырока, вольна,
Плывуць, як ветразі надзей…
Хто з гэтакаю сілай здольны
Ускалыхнуць жыцьцё людзей?

Бунтуе квецень маладая,
Якую кормяць карані.
Зямля нявестай выглядае
Сярод касьмічнае радні.

Плывуць сінечаю да сонца
Ружова-белыя вянкі,

Трымцяць пялёсткі на далоньцы,

На пасмах ля тваёй шчакі.

Каханая,

Падай мне рукі...

Лічыць ня будзем мы гады,

Бо нам прарочаць неўміручасьць

Сваёй адвагаю сады.

KAMUNIKAT.org

# КУПАЮ ДАЧКУ

Я шчасьлівейшай справы, чым такая,
Ня мог прысьніць і ў мроі самай лепшай —
Дачку купаю, а яна рукамі
З высокай белай пены нешта лепіць.

Любоў і радасьць дораць сьвету вочы,
Блакіт у іх цьвіце, мігціць цяпельцам.

Пад даланёй, нібы нацёрта воскам,
Сыпявае далікатненькае цельца.

Малая прыўзьнялася на каленькі,
Вымаю цёплую яе з глыбокіх
ночваў...
Тчэ завіруха шлюбныя сукенкі
Для маладзенькіх яблынь цёмнай
ноччу.

KAMUNIKAT.org

*        *        *

Першая маршчынка
Сьлед свой правяла...
Дзе ж мая дзяўчынка,
Што, як мак, цьвіла?

Той, хто поплеч крочыць,
Зблізу не відзён.
Коціцца клубочак
Мітусьлівых дзён.

За ягонай ніткай
Толькі пасьпявай,
Ды ня падай ніцма:
Калі што — трывай!

Але ўсё ж нікому
Не мінуць пары,
Як паклічуць з дому
Звонкія бары.

Павуцінак срэбра
Нагадае нам —
Давяраць патрэбна
Кожным новым дням.

Адцьвітае верас —
Ява ў ціхім сьне.
А лісьцінцы веры
Доўга зелянець.

## ВІШНЯ

Ад ласкі сонечнай стамлёная,
Цяжкая ад зямных шчадрот,
Галінка з вішнямі чырвонымі
Перахілілася праз шлюг.

Дождж сыпануў, ліпнёвы, цёплы,
Гарачы пыл з лістоты змыў,
І пасяліўся ў кожнай кроплі
Вялікі сьвет.
А з ім — і мы.

Гарэлі ягады спакусныя

Пудлівым полымем пакут...
Як я сачыў за тымі вуснамі,
Што цалавалі сыпелы цуд!

Зямля плыла...
Куды?
Ня ведаю...
Гайдаўся неба вечны звон —
То гуў вясельнаю бяседаю,
То закалыхваў, нібы сон...

А лёс — сваёй, чужою воляю —
Вузлом завязваўся такім,
Што і цяпер расьцяць ня здолееш,

Хоць мучайся над ім вякі.

Ды мне за часу перагонамі
Так лёгка ўсэрцы берагчы
Галінку з вішнямі чырвонымі
На сарамяжлівым плячы.

KAMUNIKAT.org

# прыступкі мілосьці



# ТЫ НЕ КРЫЎДУЙ

Ты не крыўдуй ніколі на мяне...

Пад белым сьнегам
Тлумны дзень засьне
І толькі згадкай непатрэбнай
стане.
Так і жыцьцё паціху праміне,
Адзін спадзеў на новае сьвітаньне.

І хоць мая мяцежная душа
На рынку дваццаць першага
стагодзьдзя,

Як і раней,
Няварта ні граша,
Я застаюся зь ёй адной у згодзе.

Паэт — не паратунак у бядзе,
Мяне і на сябе ўжо не хапае.
Але мой верш за волю бой вядзе,
Яго надзея-дзея — не сьляпая.

Упаў на Беларусь арлісты цень,
Уласны лёс
Ля прорвы торыць сьцежку...
Ды суцяшэньне ёсьць на чорны дзень —
Ня медны грошык,

А каханьня ўсьмешка.

Яна перад вачмі, як талісман.
Як абярог у непрытульным сьвеце.
І там,
Дзе існасьць ахіне туман,
Сваёю неўміручасьцю пасьвеціць.

Ты не крыўдуй ніколі на мяне
За змарнаваны час,
За парываньні...
Я да цябе прыйду і ў вечным сьне,
Каб папрасіць мілосьці
дараваньня.
Ты не крыўдуй ніколі намяне...

# ВЕЧНЫ СКАЗ

Малітву сьвітальную не параўнаць
З уздыхам душы
ў цішыні вечаровай...
І гэтыя словы спрадвечна гучаць,
Нібы ўпершыню,
апантана і нова.
Яны на Зямлі ратавалі мяне,
Куды з ласкі Боскай
я трапіў у госьці,
І хочацца верыць,
што не абміне
Душу

kamunikat.org

іншы сьвет
незабыўнай мілосьцю,
Каб там,
дзе чародка нябёсаў скубе
Блакітныя травы
высокага неба,
Пачуць росны шэпт:
«Я кахаю цябе...»
Мне болей нічога,
нічога ня трэба.

## ГАЛІНКА

Ты адхінула росную галінку,
Адкрыла мне чаромхавыя нетры.
І я да цішы белай прытуліўся
І захлынуўся маладым паветрам.

Пасьля вяртала памяць неаднойчы
Імгненьне, дзе адчайна выплывалі
З пялёсткавай завеі толькі вочы,
Шчасьлівыя, без парушынкі жалю.

Мой дзень,
Як колас,

Долу пахіліўся

У полі апусьцелым, безгалосым...

А тая — з-пад рукі тваёй —

галінка

Калышацца, гайдаецца над лёсам.

KAMUNIKAT.org

## ВЕЧАРЭЕ...

Вечарэе…
Пацямнелі воды
У вірах няспыннае ракі.
Дзень, які зьнікае назаўсёды,
Прыгарнуўся да тваёй шчакі.

З поля, дзе стаіць сьцяною жыта,
Васільковы туманок плыве.
Быццам успамін аб перажытым,
Узыходзяць росы на траве.

Вечарэе…

Пад аўжэлі цені,

Каб таўчы начы густы замес.

Сьвет, які буяніў, летуценіў,

Набывае новы сэнс і зьмест.

Нейкай непазбытнаю трывогай

Позірк твой высьвечвае душу.

На цябе, нібы перад дарогай.

Я гляджу, спагады не прашу.

Вечарэе...

Мілае аблічча

Хутка паглыне няўмольны змрок.

Гэта лёс мяне зацята кліча

За сваю мілосьць плаціць аброк.

І чаму ён радасьць нашу засьціць,

І куды нябогу павядзе?

Чым плаціць?

А толькі ціхім шчасьцем

Пасядзець на камні пры вадзе.

Апусьці далоні ў цемру плыні,

І душа наноў адчуе час...

Час, які ніколі не загіне,

Час, які стралой ляціць праз нас.

KAMUNIKAT.org

# ПРАБАЧ

Прабач,
Што так хутка жыццё пралятае —
Нібыта прылашчыў
І зьнік дзіўны сон...
Мая веснавая,
Мая залатая.
Ня ведаю — колькі мне выпадзе дзён,
Ня ведаю — колькі мне суджана крочыць,
Каб раптам да самага краю

дайсьці.

Ды дзякую лёсу за сьмелыя вочы,

За цуд непаўторны ў нягеглым

быцьці.

Мая веснавая,

Мая залатая,

Я больш у зязюлькі гадоў не

пытаю…

Хоць сьмерць не разлучыць

Ні душы,

Ні целы,

Прабач,

Што так хутка

Жыцьцё праляцела.

# КАХАНЬНЕ

Яно апраўдвае жыцьцё,
Гарыць, ня ведаючы стомы.
Каханьне — тое пачуцьцё,
З якім не саўладаць нікому.

Бо кожны — грэшнік ці сьвяты —
Не абміне палону страсьці,
Але яно з прадметаў тых,
Якіх ня вымаліць, ня ўкрасьці.

Што я сказаў?
Яно — прадмет?

Так нельга гаварыць паэту.

Адзіная на цэлы сьвет,

Прабач,

Прабач за выраз гэты.

Са мною ты,

І сьвет прыціх,

Глядзіць на нас,

Нібы на сьвечку...

Хто раб?

Хто Бог?

Спыніўся міг.

Спыніўся міг —

Такі, як вечнасьць.

kamunikat.org

*      *      *

Плынь гвалту накрывае нас...
Падай руку, а я — табе...
І мы ўцякаем
Ад чэргаў да зьбяднелых кас,
Ад трафарэтных, нудных фраз,
Ад вэрхалу, што кожны раз
Усіх бязбожна ашукае.

Плынь радасьці люляе нас...
Над сьветам — цішыня якая!
Перацякае ў вечнасьць час,
Той час, які застыў якраз,

І ты са мной,

І я з табой —

У ім зьні-ка-ем...

KAMUNIKAT.org

# НАЧНЫЯ ВЯТРЫ

Якія над сьветам скуголяць вятры,
Якія над сьветам шугаюць вятры! ..
Ты чуеш, каханая, іх?..
Я ведаю: чуеш і хочаш акрыць
Ад холаду стоены міг.

Ты хочаш сваёю пяшчотнай рукой,
Плячом, што бялее скрозь змрок,
Ад гвалту вятроў засланіць той спакой,
Які прыблукаў незнарок.

Ты цёплымі вуснамі хочаш
сказаць,
Што выйсьця няма з тупіку.
Самоты тваёй маладая сьляза
Мне капнула зноў на шчаку.

Ты хочаш мяне ўратаваць, як
дзіця,
Але не ад сьмерці,
А больш — ад жыцьця.
Ня плач,
Не тужы,
Не шкадуй ні аб чым,
Нічога ў жыцьця не прасі...

Давай, як ля Вечальля, зноў памаўчым,
Пачуем, як трубяць ласі.

Далёка яшчэ да наступнай зары,
Далёка яшчэ да апошняй зары...
Засьні, каб прадоўжыўся міг,
Той міг, у якім я шчасьліва заціх...

Якія над сьветам скуголяць вятры,
Якія над сьветам шугаюць вятры!..
Ня слухай, каханая, іх...

knihi.org

## ЦЁМНЫЯ ВОДЫ ВОСЕНІ

Хутка зазімак возьмецца —
Гусцее, чарнее вада.
Чайка крычыць над возерам…
А можа, галосіць бяда?

Ліст,
　　　што плаваў пад просінню,
У вечнасць вятрыска панёс.
Цёмныя воды восені
Захліствають стомлены лёс.

Лёс,
　　якому агледзіны

Наладзяцца толькі адны:
Радасьці хлеб ня зьедзены,
Ня выпіты кубак віны.

Крыжык пакут,
                што носім мы,
Сагрэецца нашай крывёй...
Цёмныя воды восені
Прасьветлены ўсьмешкай тваёй.

*　　*　　*

Тыя коні не пасьвяцца ў травах
мурожных,
Не бяруць хлеб даверліва зь
цёплай далоні...
Я жыву,
адчуваючы жылкаю
кожнай,
Што мяне даганяюць шалёныя
коні.
Час,
як дзікі табун,
капытамі лёс

kamunikat.org

месіць,

Ён наперад ляціць стрымгалоў,

без супыну.

Год цяпер непрыкметна

сьціскаецца ў месяц,

І становіцца месяц

кароткай хвілінай.

Адплываюць бярозкамі

белыя рукі,

І сьпяшаюць нябёсы вачэй

усьміхнуцца.

Нельга нават прыстоіць прад

вечнай разлукай,

Немагчыма назад,

хоць бы раз,

азірнуцца.

За сыпіной тупацяць.

ржуць

шалёныя коні...

Адчуваю — хутка дагоняць.

KAMUNIKAT.org

# ВОЧЫ

У сьвеце сумна і трывожна.
Зьліліся ў пекла
дні і ночы,
І звар'яцець,
дальбог жа,
можна,
Калі б ня радасныя вочы.

Яны пяшчотаю прывецяць
Душу,
нібы прамень крыніцу,
А самі застаюцца вечнай,
Неразгаданай таямніцай.

KAMUNIKAT.org

Ніхто ніколі не сурочыць
Народзін вашых час жаданы.
Кахайце,
                радасныя вочы,
Любіце,
              радасныя вочы,
Сьпявайце,
                  радасныя вочы,
Ляціце,
            радасныя вочы,
Сьвяціце,
               радасныя вочы
І мне,
 і сьвету апантана.

# ТЫ — ГЭТА Я

Ты — гэта я,

Я — гэта ты,

Выйшлі абое сюды з любаты,

З неразгаданай нікім мілаты.

Выйшлі, каб выпадак, слаўны такі,

Зьвёў вочы ў вочы, руку да рукі.

Мы з прыцягненьня далёкіх плянэт

Сьмела і рупна зьляпілі свой сьвет.

Як непакоіць і позірк. і слых

Недасягальная тайна дваіх!

kamunikat.org

Толькі дасужасьць усіх плеткароў
Нам не суцішыць бунтоўную кроў.

Зайздрасьць людзкая нас
сьмешыць даўно,
Хмеліць, нібы маладое віно.
Мы п'ем бяз стомы сваю мілату,
Лашчым і песьцім сваю любату.

Ты — гэта я,
Я — гэта ты,
Надта замес атрымаўся круты.

Як жа цяпер мне пайсьці ў немату,

У неразгаданасьць,

У пустату?

KAMUNIKAT.org

*          *          *

Лепей ня будзе.

Ды і навошта?

Кружыць твой позірк мне

галаву…

Дзесьці блукае апошняя пошта,

Покуль блукае — яшчэ пажыву.

KAMUNIKAT.org

# АПОШНІЯ ГУСІ

Гусі апошнія

стомленым клінам

Неба ўзаралі,

самотна крычаць…

Мне,

як заўжды,

у такую хвіліну

Хочацца разам з табой памаўчаць.

Хочацца тут —

у бары азалелым,

Дзе вымятаюць лісьцё скразнякі,

Сесьці цішком

на пяньку абышшэлым

І прытуліцца — шчакой да шчакі.

Гусі крычаць,

бо прыйшло разьвітаньне,

Дзесьці прадзецца кудзеля зімы.

Крыл калыханьне,

як наша дыханьне,

Наша дыханьне,

як крыл калыханьне...

Вырай праз вечнасьць...

І ў выраі — мы.

*         *         *

Стаю на прадзьмутай вятрамі

плятформе.

Яна не прыехала…

Хочацца выць...

Шукае ўвесь сьвет мадэрновыя

формы,

А сэрца і сёньня

Клясычна баліць.

*          *          *

Пульсуе за акном трагічна зорка,
Яе няма ўжо, ды ляціць сьвятло…
І ты ў бязладным сьне ўздыхаеш горка,
Відаць, па тым, што адцьвіло, сышло.

Пры вас сяджу,
І дума горбіць плечы,
Касьмічны жаль бярэ душу ў палон.
Любіць жыццё —

Занятак небясьпечны,

Яно само пастаўлена на кон.

Нібы ў царкве,

Пад Млечным Шляхам ціха.

Калыша Вечнасьць росную

Зямлю…

З журботнага цяпла тваіх уздыхаў

Я да жыцьця давер яшчэ ляплю.

KAMUNIKAT.org

# НЕБЯСЬПЕКА

*Міхайлу Шаўчэнку*

Зноў на праспэкце —
Паводка дзявочая:
Сьмех мілагучны, надзей галасы.
Дзіўна, але Дастаеўскі ня збочвае
З памяці тут — у разгуле красы.

Клясыку веру, а існасьць упартая
Тое прароцтва ўспрымае, як ёсьць:
Можа ўратуе ўвесь сьвет,
Ды інфарктамі
Век мой уласны
Даб'е прыгажосьць.

Згінуць заўчасна баюся да змогі я,
Нават калі б мне сьвяціў
маўзалей…
Рыжавалосыя і даўганогія,
Вы аббягайце мяне, як далей!

KAMUNIKAT.org

# ПРА СПРАДВЕЧНУЮ БЯДУ

Адамава племя, як трапіў сюды,
Шаную ўвесь час чын па чыну,
Я нават уславіў жанчыны сьляды,
Ды, Божа, ратуй нас ад страшнай
бяды
Пра нешта спрачацца з жанчынай.

Спрачацца з жанчынай — нібы
піць віно,
Уляжаш — ня выпусьціць зельле.
Тады назаўжды застаецца адно:

Глядзець без супынку старое кіно,
Хадзіць па жыцьці, як з пахмельля.

З ёй лясы тачыць можна месяц і
год,
А зрух — толькі буркату
шлунку...
І ў бедных мужчын ёсьць адзіны
зыход —
На гэты, заўсёды адчынены рот
Навесіць замок пацалунку.

# КОШКА,
# ЯКАЯ БЛУКАЕ САМА
# ПА САБЕ
*(жарт)*

Мілых істотаў нямала вандруе па
сьвеце,
Многія носяць задзірыста зорку ў
ілбе.
Толькі заўсёды яна на асобнай
прыкмеце —
Кошка, якая блукае сама па сабе.

Сьвецяцца вабнай іскрынкаю
сьмелыя вочы,
Вось ужо кіпцік па нейчым спакоі
шкрабе...
Доля цяжкая ў таго, хто
прылашчыць захоча
Кошку, якая блукае сама па сабе.

Што будзе заўтра?
А гэта і ёй не вядома.
Не давяраецца воля пустой
варажбе.
Ды безумоўна адно — не
валодаць нікому

Кошкай, якая блукае сама па сабе.

Зірк мімаходзь...
А жыццё падстаўляе падножку,
Каб упусьціў ты хатуль, што нясеш
на гарбе...
Хто і загубіць цябе, дык адзіная
кошка,
Кошка, якая блукае сама па сабе.

KAMUNIKAT.org

# ПЭСЫМІСТЫЧНА-АПТЫМІСТЫЧНЫЯ СТРОФЫ

Ашукаўся стары верабей на мякіне...
Думаў — ласкам і ўцехам ня будзе канца.
А цяпер паціхеньку, па кропельцы гіне,
Каб мянушкі займець — слепака і глушца.

Твар у зморшчынах, чуб пасівелы,

злыселы
Пастаянна талдычаць яму, што
сьпярша
Не жанчыны ўцякаюць, а ўласнае
цела...

Не бядуй, верабей! Засталася
душа...

*         *         *

Калі б не каханьне,
То гэты сьвет
Ня меў бы сэнсу і плёну...
Сьвечка бяз полымя —
Проста прадмет:
НЕ-А-ДУ-ШАЎ-ЛЁ-НЫ.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

За пачуцьцём не пасьпявае слова...
Ня словам карыстаецца здаўна
Каханьня нестрыножаная мова,
Але для ўсіх даступная яна.

KAMUNIKAT.org

*            *            *

Жыцьцё, якое рэй вяло,
Гуло, сьмяялася, цьвіло,
Кахала, плакала, кляло,
Атруту, як віно, ліло,
Паблытала дабро і зло,
Згубіла пэўнасьці вясло,
Сябе ператварыла ў тло...
І зараз сьвет — пусты...
Навошта б гэта ўсё было,
Калі б ня ты?

# С Ь Л Я П Ы   Д О Ж Д Ж

Дождж быў сьляпы...
Я добра помню,
Бо на душы яго таўро.
Наперарэз гарачым промням
Ляцела зь неба серабро.

Нібы дзіця, што мела цацкі,
Ды ўраз пазбавілася ўцех,
Цябе палонілі зьнянацку.
Адначасова плач і сьмех.

Сказаліся ня тыя словы,

Але ня вернеш іх назад.
Надзея стала выпадковай,
Усё было ўжо неўпапад…

Тым успамінам нецьвярозы
Праз дождж сыляпы
Туды гляджу...
Халодзяць мілы тварык сылёзы
І кроплі сьмелага дажджу.

KAMUNIKAT.org

## ВЕЯ

Вея шукае
Забытыя сьцежкі,
Кожную зь іх не міне...
Словы прыходзяць
Жадана і ўсьцешна:
«Дзякуй табе за мяне…»

Дзякуй табе
За лясныя азёры,
Дзе заблукала лыжня,
Дзе нашай радасьці
Дзіўную змору
Выпіла ўсмак цішыня.

Лёс праз гады
Шмат спазнаў і агораў...
Самай найлепшай з навін
Сынег малады
Ты паклікала ў горад...
Дзякуй за ціхі ўспамін.

Сынег будзе доўга
Кружыцца,
Сваволіць,
Як і тады — трапяткі.
Зь ім у суладзьдзі
Вышэйшая воля
Шчодра дыктуе радкі.

kamunikat.org

І не бяды,
Што настрою лірычнасьць
Хутка парушаць няўзнак
Першым сігналам сваім
Электрычка,
Стукам глухім таварняк.

Чуйнаму сэрцу
Сьнежна, сьвітальна...
Ты страпянулася ў сьне.
Вушка падстаў,
Мой анёл ратавальны:

«Дзякуй табе за мяне…»

# НА АЎТОБУСНЫМ ПРЫПЫНКУ

Бабулькі аглядаюць сьвет сур'ёзна,
Бягуць асталявацца, як ямчэй.
Хаваюць ногі ў венах варыкозных
Пад лаўку — далей ад чужых
вачэй.

Стаяць скульптурна, годна
маладзіцы,
Як выклік неўтаймоўнае красы.
А побач звонка цінькаюць сініцы
—

Чуваць дзяўчатак мілых галасы.

Яны ў сваю чароўнасьць млосна
верацы,
Ім радасна пляткарыць,
шчабятаць.
Прысуд наўзмаш выносяць
кавалеру:
«Такі стары, яму ўжо дваццаць
пяць!»

Ласкава сонца саграе сівіны,
Прыгожа глыбіць вочы-васількі,
Усьмешліва, з пяшчотаю

няспынна й

Цалу е яблык юнае шчакі.

І я, ва ўсіх адразу закаханы,

Знаходжу сказ да месца нездарма:

«Усё на сьвеце будзе занядбана,

А для жанчын мінулага няма!»

KAMUNIKAT.org

# БЕЛАЯ СУКЕНАЧКА

Белая сукеначка мільгнула
На начной сьцяжыне ўскрай сяла
І мілосьцю вольнай ахінула
Сэрца неспакойнае:
«Прыйшла...»

Быў пасьля і гордым, і паніклым,
Быў бядой раструшчаным амаль.
Белая сукеначка нязьнікла
Ветразем паміж будзённых хваль.

Хутка цела цёмнай глебай стане,
А душа рванецца на сьвятло.

Што было?
Адзінае — каханьне,
Рэшта — сумятня і мараў тло.

Адпакутваўся і адкружыўся
Па чужых і па сваіх сьлядах.
У ажыннай квецені сьцяжынка
Выведзе мяне на Млечны Шлях.

Позіркам расстайным аббягаю
Сьвет.
Што адплывае ў забыцьцё…
Белая сукеначка лягаю
Прамільгнула.
Як маё жыцьцё.

## МАЦНЕЙ ДАРАЖУ

Нікому жыццё паўтарыць
немагчыма,
Даецца ашчадна і шчодра — адно.
І як бы зязюлька яго ні лічыла,
А фініш бязьлітасны мае яно.

То з выраю,
То за далёкае мора
Ганцамі свабоды ляцяць жураўлі.
Дні радасьці,
Дні непазбыўнага гора
Стагуюцца так,
Як прыйшлі,
Адышлі.

Ня выкінеш і не закрэсьліш ніводны,
Надзеяй узяты ў спакусны палон…
І сам непрыкметна на ўсё станеш згодным,
Прымаючы вечны прыродны закон.

Ды ўсё-ткі насуперак долі зласьлівай
Аблічча тваё прасьвятляе імжу…
Наколькі мой час карацее імкліва —
Настолькі каханьнем мацней даражу.

# ПАЛЬЧЫК

Прыклала свой пальчык да вуснаў:
«Маўчы...»,
Вяла па прыступках мілосьці ў
нябёсы...
Мне помніцца млосная
сьпеўнасьць начы,
Якая сьпяліла сьвітальныя росы.

Люляў нашы душы акрылены
сплаў
Бунтоўнай свабоды і ціхай пакоры
У ложку з густых, долам высланых

траў,
З адбітых у кропельках
сьвежасьці зорак.

Плыве праз жыцьцё цуд са мной і
цяпер,
Яго не замгліла расхлістанасьць
долі,
Бо пальчык —
Да шчасьця ўказальны той перст
—
На вуснах ляжыць і ня зьнікне
ніколі.

# ПЕРШЫ ПАЦАЛУНАК

Ляжаў вялікі, белы камень тут —
Каля бруі прыветнае крыніцы.
Як брат з сястрою, у любімы кут
Мы беглі, каб красою наталіцца.

Але ў той дзень загадкавы віхор
Нас выхапіў з зямнога летуценьня,
Дзе конікаў ня моўк бязладны хор,
Мільгалі сьлюдзяных стракозаў
цені.

Паўстала тое, што лунала ў снах,

Сатканых з позіркаў і шэптаў
кветак.
Маланкавай вясны зялёны шлях
Імкнуўся сьпешна да раскошы
лета.

Раптоўна сьвет асьлеп,
Аглух
І сьціх,
Зачараваны сьмеласьцю
спакуснай.
Забыўшыся няўзнак на ўсё і ўсіх,
Раскрыліся, нібы пупышкі, вусны.

Дайсці ў трымценьні не змаглі яны
Да таямніц сьпякотнага каханьня.
Хоць мы былі прад вечнасьцю адны,
Ды толькі сутыкнуліся дыханьні.

Такога пачуцьця ня меў пасьля,
Хоць зьвязана жыцьцё ў апошні клунак.
З-пад ног сплыла і зьнікла дзесь Зямля…
А гэта быў мой першы пацалунак.

# ЗЬМЕСТ

## Дарунак долі

Суніцы

Сонечны верш

Таямніца

«Ёсць назвы…»

«Гэтыя бровы…»

«Маладым пачуццём…»

Тое

«Старэе ўсё…»

Прыкметы

Помню

«Спачатку — ты...»

Вяртаньне радасьці

Усьмешка жанчыны

«Мне сьніцца мора...»

Разьвітаньне зАктэбелем

«Круг звыклай мітусьні...»

Тваё імя

«Сваіх гадоў...»

Бяссоньне

Не хачу ведаць

«Лёс прывядзе...»

«Замаім акном шалее вецер...»

«Калі закіпае ад рэўнасьці кроў

Абярог

«Пранясуццаў парыве адным…»

Ніцая вярба

Ціш

«Я кахаю цябе...»

«А нехапае адзінага — часу…»

Ня верыў я

Пабудзь са мной

Праўдзівы жарт

Чарга

«Жыцьцё людзкое...»

Незьнікай!

Узьнясеньне

Прыйшла!

kamunikat.org

«Зноў дажджынкі — ...»

Не забыцца

«Ніхто!»

Кароткая ночка

Цягнік

«Вецер галін не хістае...»

Сьнегапад

Ратунак

Салоўкі *(баляда)*

Два лёсы

**Радкі маёй вясны**

А я іду

Берагі

Чаканьне

Маўчаньне

Спатканьне

Едуць маладыя

Табс адной

«Увагай шчырай…»

Заламіў асінку хлопец

Вясло

Чаромхавыя вёсны

Май

«А за вясной акрыленай …»

«Нас вывела сцяжынка…»

Кладка

«Дажджы ўжо надакучылі…»

«Бэз духмянай весткаю…»

Дзесяціклясьніцы

Сыцежка ад студні

Квецень

Купаю дачку

«Першая маршчынка...»

Вішня

**Прыступкі мілосьці**

Ты не крыўдуй

Вечны сказ

Галінка

Вечарэе

Прабач

Каханьне

«Плынь гвалту накрывае нас...»

kamunikat.org

Начныя вятры

Цёмныя воды восені

«Тыя коні не пасьвяцца ...»

Вочы

Ты — гэта я

«Лепей ня будзе…»

Апошнія гусі

«Стаю на прадзьмутай в.....»

«Пульсуе за акном…»

Небясьпека

Пра спрадвечную бяду

Кошка, якая блукае сама

Пэсымістычна-аптымістычныя

строфы

«Калі б не каханьне…»

«За пачуцьцём не пасьпявае слова...»

«Жыцьцё, якое рэй вяло…»

Сьляпы дождж

Вея

На аўтобусным прыпынку

Белая сукеначка

Мацней даражу

Пальчык

Першы пацалунак

KAMUNIKAT.org

*Літаратурка-мастацкае выданьне*
**Законьнікаў** Сяргей Іванавіч
Першы пацалунак
*Сто вершаў пра каханьне*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *М. Скобла*
Камп'ютэрны набор *С. Законьнікава*
Вёрстка Л. *Баўчок*
Карэктар *А. Вялічка*

Падпісана да друку 4.07.2007 г.
Фармат 60x84 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Друк на рызографе.
Ум. друк. 3,72 арк. Ул.-выд. 2,4 арк.
Наклад 3ОО паас. Зак. 857.
kamunikat.org

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0131712 ад 12.05.06.
220112, Мінск, вул. Я. Лучыны, 38-93,
**Тэл./факс (017) 204-86-97,**
**тэл. (029) 772-19-14, 912-83-86.**

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў друкарні ПУП «Ходр» ГА «БелТІЗ».
ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.04.
220004, г. Мімск, вул. Вызваленыія. 9.

KAMUNIA.org